ДУК “ПІНСКАЯ ГАРАДСКАЯ ЦЭНТРАЛІЗАВАНАЯ БІБЛІЯТЭЧНАЯ СІСТЭМА”
АДДЗЕЛ АБСЛУГОЎВАННЯ І ІНФАРМАЦЫІ
СЕКТАР КРАЯЗНАЎСТВА

# Краязнаўчы каляндар



## 2024 год

Пінск, 2023

# *Краязнаўчы каляндар на 2024 год*

**115** гадоў з часу адкрыцця ў г. Пінску **МЕЛАВОЙ ФАБРЫКІ** Уладаўскага (1909)

**25** гадоў з часу заснавання ландшафтнага заказніка рэспубліканскага значэння «**СЯРЭДНЯЯ ПРЫПЯЦЬ**» (Пінскі, Лунінецкі, Столінскі і Жыткавіцкі р-ны; 1999)

## *Студзень*

**1** **100** гадоў з дня нараджэння **РАМУАЛЬДА ЗДЗІСЛАВА КЛЯКОЎСКАГА** (1924, Пінск), вучонага ў галіне экалогіі і экалагічнай біяэнергетыкі, акадэміка Польскай АН, замежнага члена НАН Беларусі.

**8** **70** гадоў з часу ліквідацыі на падставе Загада Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР **БАРАНАВІЦКАЙ І ПІНСКАЙ АБЛАСЦЕЙ**, тэрыторыя якіх увайшла ў склад Брэсцкай вобласці (1954)

**13** **125** гадоў з дня нараджэння **ВАСІЛЯ ЗАХАРАВІЧА КАРЖА** (1899, Салігорскі р-н – 1967), ваеннага дзеяча, генерал-маёра, аднаго з арганізатараў і кіраўнікоў партызанскага руху на Беларусі ў Вялікую Айчынную вайну, Героя Савецкага Сюза (1944)

## *Люты*

**8 530** гадоў з дня нараджэння **БОНЫ СФОРЦА** (1494–1557), каралевы польскай і вялікай княгіні літоўскай

**4 125** гадоў з дня нараджэння **РЫГОРА МАЦВЕЕВІЧА ЛІНЬКОВА** (1899–1961), аднаго з кіраўнікоў партызанскага руху ў Пінскай і Баранавіцкай абласцях у Вялікую Айчынную вайну, Героя Савецкага Саюза (1943)

**28 30** гадоў з часу стварэння рэспубліканскага ландшафтнага заказніка **ПРАСТЫР** (Пінскі р-н; 1994)

## *Сакавік*

**4 390** гадоў з дня нараджэння **КАЗІМІРА ЛЫШЧЫНСКАГА** (1634, Брэсцкі пав. – 1689), мысліцеля, грамадска-палітычнага дзеяча, педагога

**12 95** гадоў з дня нараджэння **УЛАДЗІМІРА ГАЎРЫЛАВІЧА КОЛБА** (1929, Пінскі р-н), вучонага ў галіне клінічнай біяхіміі, заслужанага дзеяча навукі Беларусі

## *Красавік*

12 **65** гадоў з дня нараджэння **НАТАЛЛІ УЛАДЗІМІРАЎНЫ ПРЫСТУПЫ** (1959, Пінскі р-н – 2006), пісьменніцы

## *Май*

**7 80** гадоў з дня нараджэння **АЛЕНЫ СЯРГЕЕЎНЫ ЦЯЛЬКОВАЙ** (1944, Пінск), спявачкі, народнай артысткі Беларусі, мастацкага кіраўніка фальклорнай групы “Купалінка” Беларускай дзяржаўнай філармоніі

**22 85** гадоў з дня нараджэння **СЯРГЕЯ УЛАДЗІМІРАВІЧА ФЕДАРОВІЧА** (1939, Пінскі р-н), вучонага ў галіне алергалогіі, імуналогіі, прафпаталогіі, заслужанага дзеяча навукі Беларусі, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі (2002)

## *Чэрвень*

**29 45** гадоў з часу стварэння **РУВП «ЗАВОД “КАМЕРТОН” НАВУКОВА-ВЫТВОРЧАГА АБ’ЯДНАННЯ “ІНТЭГРАЛ”»,** аднаго з буйнейшых прадпрыемстваў Рэспублікі Беларусь і СНД у галіне электроннай прамысловасці і адзінага вытворца крэмніевых пласцін на тэрыторыі Беларусі (Пінск; 1979)

## *Ліпень*

**14 80** гадоў з часу **ВЫЗВАЛЕННЯ ПІНСКА АД НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІХ ЗАХОПНІКАЎ У ВЯЛІКУЮ АЙЧЫННУЮ ВАЙНУ** (1944)

**19 70** гадоў з дня нараджэння **АНАТОЛЯ ІВАНАВІЧА ШУШКО** (1954 – 2018), Пінскі р-н, пісьменніка

## *Верасень*

**85** гадоў з часу заснавання **ААТ “ПІНСКІ МЯСАКАМБІНАТ”** (Пінск; 1939), прадпрыемства па перапрацоўцы мяса, лаўрэата конкурсаў “Лепшыя тавары Рэспублікі Беларусь” (2003, 2009, 2010, 2012) і “Лепшыя тавары Рэспублікі Беларусь на рынку Расійскай Федэрацыі” (2007)

**26 30** гадоў з часу заснавання рэспубліканскага біялагічнага заказніка **ТЫРВОВІЧЫ** (Пінскі р-н; 1994)

**28** **70** гадоў з дня нараджэння **ТАЦЦЯНЫ АЛЯКСАНДРАЎНЫ ГРЫШКО** (1954, Пінскі р-н), спартсменкі (інваспорт, стральба з лука), чэмпіёнкі IX Паралімпійскіх гульняў (1992, Барселона), бронзавага прызёра чэмпіянату свету (1990), чэмпіёнкі (1991) і бронзавага прызёра (1991, 2006) чэмпіянатаў Еўропы, чэмпіёнкі СССР (1989–1991) і СНД (1992), мнагакратнай чэмпіёнкі Беларусі (1993–2004)

**30** **110** гадоў з дня нараджэння **ДАНІЛЫ КАНСТАНЦІНАВІЧА МІЦКЕВІЧА** (1914, Пінск – 1996), вучонага-хіміка, сына Я. Коласа, збіральніка і папулярызатара спадчыны песняра, арганізатара Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа, заслужанага дзеяча культуры Беларусі.

## *Кастрычнік*

**65** гадоў з пачатку выпуску першай прадукцыі **ААТ “ПІНСКІ ЗАВОД ШТУЧНЫХ СКУР”** (Пінск; 1959)

**15** **80** гадоў з дня нараджэння **ЗІНОВІЯ КІРЫЛАВІЧА ПРЫГОДЗІЧА** (1944, Пінскі р-н), пісьменніка, лаўрэата прэміі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі (2013)

**21** **110** гадоў з дня нараджэння **КАЗІМІРА СВЁНТАКА (1914–2011)**, рымска-каталіцкага царкоўнага дзеяча Беларусі, арцыбіскупа-мітрапаліта, кардынала

## *Лістапад*

**9** **235** гадоў з дня нараджэння **МАРЦІНА АНТОНІ ПАЎЛОВІЧА** (1789, Пінскі р-н – 1830), вучонага-геолага, асветніка

**27** **150** гадоў з дня нараджэння **ХАІМА ВЕЙЦМАНА** (1874, Іванаўскі р-н – 1952), палітычнага і дзяржаўнага дзеяча Ізраіля, першага Прэзідэнта Дзяржавы Ізраіль, вучонага-хіміка

## *Снежань*

**85** гадоў з часу заснавання абласной газеты **“ЗАРЯ”** (Брэст; 1939)

**4** **85** гадоў з часу ўтварэння **БРЭСЦКАЙ ВОБЛАСЦІ** (1939), адмістрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі ў Беларусі

*Складальнік: Баговіч Т.К.,*
*гал. бібліятэкар аддзела абслугоўвання і інфармацыі ЦБ*
*снежань, 2023*